**Красоўскі, Д.** Моладзі – вопыт інтэрнацыяналістаў / Д. Красоўскі // Полацкі веснік. — 1999. — 12 лют. — С. 2.

## МОЛАДЗІ – ВОПЫТ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ



**Па справах былі ў Бабынічах. У размове з П. П. Бружасам, галоўным аграномам калгаса імя Мялешкі, неяк само сабой перайшлі на афганскую тэму. На падыходзе ж круглая дата – 10-годдзе з дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана. А Пятру Пятровічу лёсам было наканавана несці службу ў гэтай краіне ў якасці воіна-інтэрнацыяналіста.**

– Прызваны я быў у пагранічныя войскі, – расказвае наш субяседнік. – Трапіў у адзін з пагранатрадаў, які нёс службу на савецка-афганскай мяжы. Вось тут нам, маладым салдатам, і было прапанавана, падкрэслю — без ніякага прымусу, запісацца ў сяржантскую школу санінструктараў з паследуючай службай у Афганістане. Было нас чалавек 700, а патрабавалася ўсяго 30 курсантаў. Таму набралі добраахвотнікаў без ніякіх цяжкасцяў. У іх ліку быў і я.

У 1987 годзе быў прызначаны санінструктарам мінамётнай батарэі мабільнай пагранчасці, якая дыслацыравалася ў раёне горада Кундус. Да гэтага часу засталося непрыемнае пачуццё ад прыляцеўшай са свістам першай кулі нада мной. Бывалыя салдаты растлумачылі, што калі чуеш свіст кулі – баяцца ўжо не трэба. Небяспеку уяўляе ціхая куля. У гэтым потым сам пераканаўся, прывык, бо ў баявых абставінах не на гэта была скіравана мая ўвага – трэбо было ратаваць параненых. На мяне і прапаршчыка-доктара была ўскладзена гэта задача. Стараліся выконваць яе добрасумленна. Медалі “За боевые заслугі”, “За отличие в охране государственной границы”, якіх быў удастоены, сведчаць пра гэта.

Дарэчы, вельмі часта давадзілася аказваць медыцынскую дапамогу мірным афганцам, асабліва дзецям. Падрываліся на мінах. І тут скажу, што нас здзіўляля нечалавечая вытрымка гэтых людзей. Часам без ніякіх наркатычных сродкаў даводзілася ампутаваць знявечаную мінай руку падлетка. Бацька ці старэйшы брат нешта скажа яму на сваёй мове і ні адзін стогн не

вырвецца з яго грудзей. І зажывалі раны на іх, на дзіва, хутка. Відаць, гаючай з´яўляецца само асяроддзе, у якім яны нарадзіліся і жывуць.

Такі вось народ, афганы.

Ганаруся і сваімі саслужыўцамі. Дружба, якой былі з´ядналы мы ў тых абставінах, — гэта на ўсё жыццё. Крыўдна слухаць пра праявы дзедаўшчыны ў некаторых падраздзяленнях нашага войска. У Афгане старaслужачы быў старэйшым братам для маладога байца, аберагаў яго, дзяліўся баявым вопытам. На гэтых лепшых чалавечых якасцях мы, былыя воіны-інтэрнацыяналісты, павінны сёння выхоўваць нашу моладзь, нашу будучыню.

Нельга не пагадзіцца з гэтымі словамі Пятра Пятровіча.

**Д. Красоўскі**,
**старшыня Полацкай раённай ветэранскай арганізацыі**